**Скікевіч Т. І. (Горкі)**

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫХ ГРУП У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Лексікалогія, як і любая іншая навука аб мове, уяўляе сабой пэўную сістэму, і большасць лінгвістаў прызнае сістэмны характар самой лексікі. Аднак поўнае сістэмнае апісанне слоўнікавага складу мовы – справа даволі складаная. Гэта абумоўлена тым, што лексіка як сістэма, структура якой у вялікай ступені звязана з уплывам экстралінгвістычных фактараў, уяўляе сукупнасць сістэмных і несістэмных элементаў. Змены, якія адбываюцца ў лексіцы, абумоўленыя як гісторыяй носьбітаў дадзенай мовы, так і ўнутранымі, уласна моўнымі прычынамі. Узаемадзеянне знешніх і ўнутраных фактараў прыводзіць да разнастайнасці сістэмных адносін у лексіцы і да немагчымасці адназначнага вызначэння характару гэтых адносін. Таму перавага аддаецца вывучэнню асобных тэматычных і лексіка-семантычных груп.

Аналіз элементаў семантычнай парадыгмы моўных адзінак – адкрытае пытанне ў лінгвістычнай навуцы. Трактоўка паняццяў лексіка-семантычнай і тэматычнай (або прадметна-тэматычнай) групы выклікае шмат разыходжанняў сярод даследчыкаў. У адносінах да іх існуе і пэўная«стракатасць тэрміналогіі» [1, 39], і яны«асобнымі даследчыкамі часта атаясамліваюцца» [2, 299]. Розніца паміж лексіка-семантычнай і прадметна-тэматычнай групамі акрэсліваецца ў«Лексікалогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы» так: «У адрозненне ад прадметна-тэматычных груп, якія фарміруюцца на падставе анамасіялагічнага (логіка-паняційнага) падыходу да вывучэння лексікі, лексіка-семантычныя групы і лексіка-семантычныя палі, як правіла, даследуюцца на аснове крытэрыяў уласна лінгвістычнага характару» [2, 299].

Даследаванне тэматычных і лексіка-семантычных груп ідзе ў некалькіх напрамках: па-першае, высвятленне часу з'яўлення ў мове той ці іншай лексемы як складальнага элемента функцыянуючай групы, даследаванне шляхоў і заканамернасцяў фарміравання і развіцця дадзенай групы на дыяхранічным зрэзе: па-другое, этымалагізацыя слова, высвятленне прынцыпаў намінацыі, пакладзеных у аснову наймення, і матывацыі прыметы, пакладзенай у аснову называння.

Зразумела, гэтыя напрамкі непарыўна звязаныя паміж сабой.

Вялікую ролю ў этымалагізацыі слова адыгрывае ўстанаўленне часу яго з'яўлення ў мове. Калі мы ставім пытанне аб паходжанні того ці іншага слова, трэба спачатку высветліць, як доўна яно існуе ў дадзенай мове, у якой фанетычнай форме і з якімі асноўнымі значэннямі яно вядома ў помніках пісьменства, ці існавалі аднакаранёвыя словы і г.д.

А прасачыць працэс фарміравання пэўнай лексічнай групы магчыма толькі ў сувязі з даследаваннем этымалогіі слова, а гэта значыць, што праблема фарміравання тэматычных і лексіка-семантычных груп непарыўна

звязана з агульнымі праблемамі намінацыі.

Працэс намінацыі прадугледжвае наяўнасць двух узаемазвязаных фактараў: новага прадмета аб'ектыўнай рэчаіснасці, які патрабуе намінацыі, і сістэмы моўных знакаў, пры дапамозе якіх адбываецца яго намінацыя. Аднак працэс намінацыі – гэта і ўстанаўленне сувязі паміж моўным знакам (словам) і тым прадметам рэчаіснасці, адлюстраванне якога дало паняцце, што ўтварыла сэнсавы бок новай лексічнай адзінкі. Таму тэорыя намінацыі цесна звязана з вучэннем аб матывацыі, аб унутранай форме слова, устанаўленне якой даказвае факт існавання моўнай матываванасці, якая ляжыць у аснове стварэння новых слоў. Устанаўленне прынцыпаў намінацыі (матывацыі) і матываванасці слова ўяўляе асобы навуковы інтарэс пры вывучэнні лексіка-семантычных груп.

Пры даследаванні назваў канкрэтных прадметаў або з'яў актуальнай задачай з'яўляецца вызначэнне прынцыпаў намінацыі.

У працэсе грамадскай і пазнавальнай дзейнасці чалавек пастаянна сутыкаецца з новымі з'явамі і аб'ектамі, якія яшчэ не маюць назваў у мове. Як жа ўзнікаюць новыя найменні?

На пачатку свайго фарміравання паняцці былі максімальна звязаныя з канкрэтным пачуццёвым вобразам адлюстраванага прадмета, але з цягам часу гэта сувязь паступова гублялася. Першыя назвы ўзнікалі ў выніку адлюстравання нейкіх уласцівасцяў прадмета – колеру, гуку, паху, формы і г.д. – на ўзроўні першай ступені пачуццёвага пазнання ў момант непасрэднага ўздзеяння на органы пачуццяў чалавека. На падставе гэтага ў чалавека ўзнікала ўяўленне аб тым ці іншым прадмеце або з'яве. Але чалавек у сваёй свядомасці адлюстроўвае не ўсе ўласцівасці прадметаў, а толькі тыя, якія выклікаюць найбольш моцную рэакцыю арганізма, таму адчуванні і ўспрыняцці залежаць ад выбіральнасці органаў пачуццяў, што адыгрывае вялікую ролю ў першапачатковым працэсе іменавання. Уяўленне з'яўляецца больш высокай прыступкай пазнавальнай дзейнасці, калі ў выніку неаднаразовага знаёмства з падобнымі прадметамі адбываецца іх адлюстраванне ў свядомасці чалавека. І ў працэсе абагульнення ўзнікае паняцце аб мностве аднародных прадметаў, якія аб'ядноўваюцца ў клас, род, від.

Такім чынам, працэс намінацыі можна ўявіць як устанаўленне сувязі паміж моўным знакам (словам) і тым прадметам рэчаіснасці, адлюстраванне якога дало паняцце, што ўтварыла сэнсавы бок новай лексічнай адзінкі. У працэсе функцыянавання словы паступова мяняліся, новыя назвы фарміраваліся на аснове ўжо вядомага фанетычнага, марфалагічнага і лексічнага ладу.

Для абазначэння кожнага новага паняцця звычайна выкарыстоўвалася нейкае вядомае слова, у якім адлюстроўвалася заканамерная сувязь паміж новым паняццем і былым значэннем слова. Многія назвы, на першы погляд, не адлюстроўваюць назіраемых намі якасцяў прадметаў або з'яў, але пры лексіка-семантычнай рэканструкцыі выяўляецца цесная зыходная сувязь

паміж рэальнымі з’явамі прыроды і іх абазначэннямі ў мове, г. зн. іх матываванасць.

Агульная тэорыя намінацыі цесна звязана з вучэннем аб матывацыі, аб унутранай форме слова. Матывацыя з’яўляецца адным з першых момантаў у акце намінацыі, які абумоўлівае адбор матывавальнай прыметы і лексічнай адзінкі, якая абазначае дадзеную прымету. Часта выбар прыметы залежыць ад першаснага ўздзеяння яе на органы пачуццяў чалавека, і таму ў фарміраванні слова вялікую ролю адыгрывае суб’ектыўны фактар. Аднак выбар прыметы можа залежаць таксама ад канкрэтных умоў, навакольных абставінаў, ад зацікаўленасці ў дадзеным прадмеце і інш. Акрамя таго, адбываецца выбар моўнага матэрыялу з таго складу марфем і лексем, што існуе ў мове.

Пры намінацыі вялікую ролю таксама адыгрываюць асацыяцыі, у выніку якіх узнікае матываваная сувязь новага слова з яго папярэднікам.

Прынцып намінацыі (спосаб называння) – гэта адлюстраванне ў назве прадмета яго прыметы, уласцівасці, якасці. Але трэба адзначыць, што ў аснову назваў канкрэтных прадметаў у любой лексічнай групе могуць быць пакладзены або ўласцівасці саміх прадметаў (прамая намінацыя), або ўласцівасці іншых рэалій, з якімі гэтыя прадметы супастаўляюцца (ускосная намінацыя).

Такім чынам, усе найменні канкрэтных прадметаў маюць першапачатковую матываванасць, якая з цягам часу можа страчвацца, прычынай чаго з’яўляецца забыццё ўнутранай формы, звязанай з былым гучаннем. Слова, якое страціла ўнутраную форму, становіцца нематываваным.

**Літаратура**


1. Красней, В. П. Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія: вучэб. дапам. / В. П. Красней, У. М. Лазоўскі, І. М. Шчарбакова. – Мінск: Універсітэцкае, 1984. –175 с.
2. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы/ АН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
3. Скикевич,Т. И. Формирование лексической группы названий диких животных в русском языке: дис. … канд. филол. наук: 10.02.02 / Т. И. Скикевич. – 1998. – 112 л.